ПЕРШЫ СНЕГ? УЖО ХУТКА 3

БУЛЬБЫ ХОПІЦЬ УСІМ 9

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

19 КАСТРЫЧНІКА 2021 г. АЎТОРАК № 201 (29570)

ЦЫТАТА ДНЯ

Наталля КАЧАНАВА, Старшыня Савета Рэспублікі

«Грамадскае абмеркаванне прапануемых змяненняў у Канстытуцыю будзе шырокамаштабным. Тое, што гэта будзе абмяркоўвацца, няма ніякага сумнення. Мы для сябе разумеем, што павінны быць праваднікамі. Тыя члены Канстытуцыйнай камісіі, якія з'яўляюцца членамі Савета Рэспублікі, будуць вельмі актыўна працаваць, каб данесці навелы. Адпаведныя прапановы абмеркаваны 28 верасня на пашыраным пасяджэнні Канстытуцыйнай камісіі з удзелам кіраўніка дзяржавы. Але гэта ж не канчатковы варыянт, работа над Асноўным Законам яшчэ ідзе. Больш таго, мы, выязджаючы ў рэгіёны, сустракаючыся з людзьмі, чуем тыя прапановы, якія агучваюць людзі».

Звонкая песня з Беларусі

Ксенія Галецкая перамагла ў міжнародным фестывалі «SanRemo Junior»

Фота БелТА.

Юная спявачка Ксенія Галецкая атрымала Гран-пры на міжнародным фестывалі «SanRemo Junior», што сёлета адбыўся ў Італіі. Гэта вакальны конкурс, удзел у якім прымаюць дзеці да 15 гадоў.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў Ксеніі віншаванне, у якім гучаць такія словы:

— Ты праславіла Беларусь, паказала ўсяму свету, якая ў нас таленавітая і працавітая моладзь і як яна любіць сваю краіну. Словы падзякі і павагі хачу перадаць бацькам, педагогам, прадзюсарскаму цэнтру «Спамаш» і ўсім, хто дапамагаў табе заваяваць высокую творчую вяршыню.

СТАР. 3

КОРАТКА

- У Палацы Незалежнасці 19 кастрычніка адбудзецца вялікая нарада па сітуацыі з COVID-19 у Беларусі. Гэтае мерапрыемства стане пачаткам анансаванага раней кіраўніком дзяржавы адпаведнага тэматычнага тыдня.
- **Беларускія ўдзельнікі біржавых таргоў у студзені–верасні атрымалі эканамічны эфект у Br363 млн.**
- Міжнародны кангрэс «Бібліятэка як феномен культуры» пройдзе ў НББ.
- **На Жабінкаўскі цукровы завод разам з буракамі прывезлі гранату часоў Першай сусветнай вайны.**
- У Альшанах за невыкананне антыковідных мер прыпынілі работу рэчавага рынку.

ISSN 1990 — 763X

На слыху

«Больш сталі хварэць маладыя людзі, цяжарныя і дзеці»

УРАЧ — ПРА ТОЕ, ЯК ЦЯПЕР ПРАЯЎЛЯЕ СЯБЕ КАРАНАВІРУС

З першых дзён у людзей, якія заразіліся каранавірусам, часта назіраюцца сімптомы, падобныя на востры грып. Пры гэтым хвароба цяпер развіваецца больш імкліва. Як змяніўся каранавірус з першых хваляў і як ён сябе праяўляе? Ці можна заразіцца паўторна? Праз які час імунітэт аслабляецца і варта рабіць паўторную прышчэпку? Якія памылкі мы робім, калі лечымся ад COVID-19? Пра гэта і іншае распыталі ўрача агульнай практыкі, загадчыка аддзялення агульнай урачэбнай практыкі № 3 31-й гарадской паліклінікі Мінска Надзею КУЛІКОЎСКУЮ.

ПАЧЫНАЕЦЦА ЯК ГРЫП

— Надзея Робертаўна, ці змяніліся сімптомы COVID-19?

— Цяпер ён стаў больш падобны на тыповую вострую рэспіраторную вірусную інфекцыю ці на грып. Больш з'явілася пацыентаў з рынітамі, болямі ў горле. На мой погляд, менш сталі скардзіцца на дакучлівы сухі кашаль. Па-ранейшаму пацыенты нярэдка скардзяцца на адсутнасць нюху — анасмію. Магчыма, больш частым сімптомам стала гарачка, прычым менавіта высокая тэмпература. Калі ў першыя хвалі шмат пацыентаў звярталася са скаргамі на анасмію, з-за чаго мы пачыналі падазраваць каранавірусную інфекцыю, то цяпер многія звяртаюцца з высокай тэмпературай — 38-38,5.

СТАР. 4

Дэпутацкая акруга

ВЫХАВАННЕ ПАШАНЫ

Як у Гомелі працуюць настаўнікі юных патрыётаў

Кіраўнікі па ваенна-патрыятычным выхаванні, якія з гэтага навучальнага года з'явіліся ў школах краіны, — значная дапамога педагагічнаму калектыву. У Год народнага адзінства заклікі да актывізацыі патрыятычнай работы сярод школьнікаў — не проста словы. Між тым, сёння застаецца актуальным пытанне стварэння ў навучальных установах сур'ёзнай вучэбна-матэрыяльнай базы па дапрызыўнай падрыхтоўцы і фарміраванні патрыятычнай самасвядомасці вучняў.

Дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Віталь УТКІН з капсулай часу каля помніка ахвярам фашызму ў Гомелі.

Варта адзначыць, што ў Гомелі яшчэ два гады таму стартаваў новы праект па развіцці адукацыйнага асяроддзя для фарміравання ваенна-патрыятычнага выхавання школьнікаў. Ініцыятарам праекта выступіў на той час кіраўнік Чыгуначнага раёна Гомеля, а цяпер **дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі, член Пастаяннай камісіі па заканадаўстве Віталь УТКІН.** Парламентарый — актыўны ўдзельнік ваенна-патрыятычных мерапрыемстваў, якія праходзяць на Гомельшчыне. У сваёй рабоце ў акрузе ён у тым ліку далучаецца да правядзення патрыятычных акцый грамадскіх арганізацый.

СТАР. 7